ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА • • NO.29 (3197) • • ЧАЦВЕР, 12 ЖНІЎНЯ, 2010

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭТЫ WWW.GOLAS.BY

Госця з Марый-Эл
Вера Новік піша гісторыю роднай вёскі, што на Дзятлаўшчыне
Стар. 2

Знічкі Айчыны
Стар. 3

Кветка для дваіх
Уладзіславу Ярашэвічу падабаецца ўладарыць над агнём, рабіць метал падатлівым і “ляпіць” з яго неверагодныя рэчы
Стар. 4

Эпоха рэнесансу

Следам за гістарычнымі будынкамі ратушы, гасцініцы “Еўропа” ў Мінску ў хуткім часе могуць быць адноўлены старажытныя храмы і іншыя помнікі дойлідства

Віктар Корбут

Архітэктурная дамінанта ў цэнтры Мінска

У XX стагоддзі ў выніку войнаў і не заўсёды прадуманых рэканструкцый цэнтральных вуліц сталіца Беларусі страціла некалькі каштоўных помнікаў дойлідства. Сярод “згубленых” аб’ектаў — найстарэйшыя царква, касцёл, сінагога і мячэць. Калісьці яны былі архітэктурнымі дамінантамі раёнаў сучасных плошчаў Свабоды і Кастрычніцкай, вуліцы Нямігі і праспекта Пераможцаў. Адначасова гэта былі і сімвалы Мінска, як цэнтра розных культур — хрысціянскай, іудзейскай, мусульманскай. Сужыццё розных рэлігійных абшчын на працягу вякоў дэманстравала, што Беларусь — родны дом для ўсіх яе насельнікаў, незалежна ад нацыянальнасці і веравызнання.

Згодна з праграмай развіцця гістарычнага цэнтра Мінска, зацверджанай Прэзідэнтам, вядзецца адбудова найстарэйшай царквы Святога Духа на плошчы Свабоды. Праект яе аднаўлення быў распрацаваны яшчэ ў канцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя. Але грошы на яго ажыццяўленне знайшліся толькі сёння. Гэта сведчыць пра прынцыповую дзяржаўную пазіцыю вяртаць Старому гораду Мінска яго спрадвечнае аблічча. Як запэўніваюць у Міністэрстве культуры, царква не стане апошнім адроджаным помнікам дойлідства. Прыклад Масквы, Вільні, Рыгі, Кіева, дзе ў апошнія гады былі адбудаваны калісьці вызначальныя ў панараме гэтых гарадоў храмы, палацы, кварталы, страчаныя ў мінулым, сведчыць: “эпоха рэнесансу” ў Мінску — не выключэнне, а тэндэнцыя, уласцівая для сталіц Усходняй Еўропы. Гэтыя словы пацвярджаюцца справай: у апошнія гады ў Мінску ўжо былі адкрыты для публікі вернутыя з небыцця будынкі ратушы, гасцініцы “Еўропа”. Цяпер без іх немагчыма ўжо ўявіць горад.

У імя Святога Духа

Царква Святога Духа была збудавана ў 1636 годзе, а зруйнавана роўна праз трыста год — у 1936-м. Адметнасцю храма быў пышны фасад: нібы іканастас, размаляваны фрэскамі, прарэзаны нішамі, у якіх стаялі скульптуры святых. У царкву заўсёды трапляла многа святла дзякуючы высокім спічастым вокны. Пяць мураваных і драўляных алтароў аздаблялі інтэр’ер, на хорах з 1779 года гучаў арган. Галоўнае ж, чым праваблівала вернікаў царква, — ікона Божай Маці Мінскай, перанесеная сюды “на вечныя часы” з замкавай царквы Нараджэння Прасвятой Багародзіцы ў пачатку XVII стагоддзя. Абраз захоўваўся ў храме да самага яго зруйнавання, пасля ікону перадалі ў Беларускі дзяржаўны музей, у 1941 годзе ўрачыста ўнеслі ў Петрапаўлаўскую (тады Кацярынінскую) царкву на Нямізе, а ў 1945-м — у цяперашні Свята-Духаў кафедральны сабор.

Старажытная царква Святога Духа сваім галоўным фасадам глядзела прама на кафедральны касцёл. У 1795 годзе яна была пераасвячона з уніяцкага ў праваслаўны Петрапаўлаўскі сабор — таму і сучасная плошча Свабоды цалкам лагічна ў XIX — на пачатку XX стагоддзя называлася Саборнай, або Кафедральнай. Сабор зруйнавалі ў той час, калі ў грамадстве не было разумення каштоўнасці старажытнай архітэктуры.

Ідэя аднавіць царкву Святога Духа залунала ў той час, калі яшчэ існаваў Савецкі Саюз. Тады вядомы архітэктар-рэстаўратар Сяргей Багласаў распрацаваў праект, які не раз “пачыналі” ажыццяўляць, але суб’ектыўныя прычыны ўсё не дазвалялі давесці справу да лагічнага канца. Цяпер ужо вызначана, што нішы фасада “новай” царквы аздобяць арнаментам замест скульптур, а вокны ўпрыгожаць вітражамі. Мае быць адбудавана і галерэя, што калісьці злучала храм з жаночым манастыром базыльянак, дзе сёння размешчана музычная школа № 10. У царкве збіраюцца размясціць канцэртную залу.

Цыбуліна з Татарскіх агародаў

Да нядаўняга часу панавала думка, што папулярная сярод турыстаў гасцініца “Юбілейная” стаіць на месцы колішняй мячэці. Але даследчык гісторыі Мінска Віталь Кірычэнка нядаўна знайшоў фота другой паловы 60-х гадоў, на якім відаць, як побач з мячэццю вырастаюць паверхі “Юбілейнай”. Значыць, нейкі час два будынкі суіснавалі. На здымку храм глядзіць прама на Палац спорту — з таго месца, дзе цяпер фантан пры гасцінічным рэстаране. → Стар. 2

КАНТАКТЫ

Шмат рэальных спраў

Заходне-Паморскае ваяводства Польшчы зацікаўлена ў навукова-тэхнічным супрацоўніцтве з суседзямі

Надзея Матвеева

Пад час нядаўняга візіту польская дэлегацыя на чале з маршалкам ваяводства Уладзіславам Хусейкам наведала Парк высокіх тэхналогій і Ваенную акадэмію Беларусі. «Тут ёсць вялікія магчымасці для супрацоўніцтва, абмену досведам. Могуць з’явіцца новыя праекты», — сказаў тады маршалк. — Таксама магчыма супрацоўніцтва ў рамках праграмы «Усходняе партнёрства», каб з карысцю як для Беларусі, так і для Польшчы рэалізаваць сумесныя праекты, знайсці ўжытак тым 600 мільёнам еўра, якія зарэзерваваны пад праграму. Па меркаванні У. Хусейкі, вялікае поле для дзейнасці бачыцца ў навуковай, адукацыйнай сферах. Нездарма гэтая тэма была паднята на сустрэчы ў Беларускім тэхнічным універсітэце. «Думаю, што трэба развіваць супрацоўніцтва і ў галіне культуры, спорту, турызму», — таксама адзначыў польскі госць.

Між іншым, сярод краін ЕС Польшча з’яўляецца асноўным знешнегандлёвым партнёрам Мінскай вобласці, саступаючы толькі Германіі. Знешнегандлёвы абарот прадпрыемстваў сталічнага рэгіёна з гэтай краінай толькі за студзень-май 2010 года склаў больш за 130 мільёнаў долараў і павялічыўся ў параўнанні з аналагічным перыядам 2009-га ў два з паловай разы.

Эпоха рэнесансу

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Калісьці ў Мінску было вялікае Татарскае прадмесце. За мячэццю горад акурат канчаўся. А к Свіслачы ішлі гароды, на якіх мясцовыя жыхары, татары, вырошчвалі зеляніну, якую з ахвотай куплялі мінчане на рынках. Татары, якія пасяліліся на скрыжаванні сучасных праспекта Пераможцаў і вуліцы Мельнікайце яшчэ ў XVI стагоддзі, хадзілі на малітву ў драўляны храм.

Старая мячэць не мела мінарэта (вежы-званіцы), таму муэдзін склікаў вернікаў на набажэнства з ганку храма. У пачатку XX стагоддзя ў Мінску жыла амаль тысяча татар і яны дамагліся права на будоўлю мураванага храма. Новая мураваная мячэць вылучалася акурат высокай вежай, завершанай купалам накшталт цыбуліны, увянчанай паўмесяцам. Мінарэт добра быў відаць, напрыклад, з цяперашняй плошчы Свабоды. Храм часта змяшчалі на паштоўках з відамі горада.

У 30-я гады мячэць закрылі, пасля вайны татары спрабавалі вярнуць сабе будынак, аднак марна: мінарэт быў разабраны, а неўзабаве знесены і рэшткі помніка архітэктуры. Цяпер паводле вобразу і падабенства колішняга храма будуецца новая мячэць у раёне вуліц Грыбаедава і Татарскай. Першы камень у падмурак святыні заклалі яшчэ ў 1997 годзе, калі адзначалася 600-годдзе пасялення татар на Беларусі.



Абрысы старажытнага Мінска на малюнку невядомага мастака

Па слядах Тамаша Аквінскага

Да 1950 года на рагу сучасных вуліц Інтэрнацыянальнай і Энгельса стаяў касцёл, названы ў гонар вялікага хрысціянскага філосафа святога Тамаша Аквінскага. Гісторыкі даказалі, што гэта быў першы касцёл, пабудаваны ў Мінску не з дрэва, а з каменю. Ён меў асаблівыя муры — вельмі тоўстыя, з глыбокімі падмуркамі. У старажытным горадзе касцёл адыгрываў ролю крэпасці на падыходах да цэнтра, бо побач, па лініі сучаснага праспекта Незалежнасці, праходзіў насыпны вал — абарончая "земляная" сцяна.

У Другую сусветную вайну храм сур'ёзна пацярпеў ад абстрэлаў з неба. Але з 1926 года касцёл знаходзіўся пад аховай дзяржавы. А ў кастрычніку 1944-га газета "Чырвоная змена" паведамляла, што разам з іншымі будынкамі, пашкоджанымі ў вайну, "будзе адноўлен таксама старэйшы Дамініканскі сабор". "Дамініканскім" яго называлі невыпадкова: разам з храмам існаваў кляштар дамініканцаў, ад якога і сучасная вуліца Энгельса калісьці пазначалася на картах як Дамініканская. Дзякуючы эфектнаму фасаду касцёл лічыўся самым вытанчаным па архітэктуры ў Мінску. У інтэр'еры наведвальнікаў уражвалі 13 разных алтароў.

Як расказаў Уладзімір Дзянісаў, галоўны архівіст Нацыянальнага гістарычнага архіва, у другой палове 80-х гадоў XX стагоддзя былі раскапаны падмуркі храма: "Пасля таго, як знайшлі фундаменты, іх закансервавалі: пакрылі плёнкай, засыпалі жвірам. Меркавалася, што пасля іх накрыюць шклом, надбудуюць павільён, а з боку вуліцы Энгельса адновяць касцельную браму". Калі побач, на Кастрычніцкай плошчы, пачалася будоўля Палаца Рэспублікі, падмуркі храма не кранулі. Пакуль касцёл не плануюць аднаўляць, але тое, што яго фундамент беражліва захоўваецца, сведчыць: такія намеры ў будучыні могуць быць рэалізаваны.

Сярэднявечная крэпасць на Нямізе

Да Вялікай Айчыннай вайны палову жыхароў Мінска складалі яўрэі. Найстарэйшая ў горадзе так званая халодная сінагога была збудавана яшчэ ў канцы XVI стагоддзя. Яна перажыла вайну, але… У 1967 годзе Мінск адзначаў свае 900-годдзе. А ў 1968 годзе пачаўся знос найстарэйшай вуліцы Няміга, якую журналісты і паэты параўноўвалі з пецярбургскім Неўскім праспектам, маскоўскім Арбатам, адэскай Дзерыбасаўскай. Да 1974 года аўтэнтычнай Нямігі не стала. Уладзімір Кароль, тагачасны кіраўнік Дзяржкамітэта па справах будаўніцтва пры Савеце Міністраў, лічыў, што гэта справядліва, бо вуліца была забудавана "нічым не адметнымі у архітэктурных адносінах" дамамі. Халодная сінагога стаяла на самым пачатку Нямігі. У першай палове 60-х гадоў усутыч да яе быў прыбудаваны гмах інстытута "Белпрампраект".

Мастак Май Данцыг, карэнны мінчанін, у 1972 годзе напісаў карціну "Мой горад старажытны, малады". На палатне відаць, як прыціскаецца жоўтая сінагога да халоднага бетоннага волата "Белпрампраекта". Гэта значыць: сучасны будынак ставілі тады, калі старажытнаму яшчэ не быў падпісаны смяротны прысуд. Але ўжо ў другой палове 60-х храм не існаваў. Быў страчаны, магчыма, найстарэйшы будынак у сталіцы, у архітэктуры якога праяўляліся гатычныя і рэнесансныя матывы.

Да пачатку XXI стагоддзя на тым баку Нямігі, дзе стаяў храм, нічога не будавалі. Цяпер тут стаіць сучасны гандлёвы цэнтр з паркінгам. Месца, дзе калісьці была сінагога, у час новай будоўлі засталося некранутым. Прыйдзе час — і сюды прыйдуць рэстаўратары. Як у 70-я гады мінулага стагоддзя была адноўлена Петрапаўлаўская царква на Нямізе, а ў 90-я гады Кафедральны касцёл на плошчы Свабоды, цяпер жа і Святадухаўская царква, так рана ці позна дойдуць рукі ў архітэктараў і да іншых выдатных помнікаў дойлідства. Эпоха Адраджэння ў Мінску працягваецца.

ПОШУК

Таямніцы Аўгустоўскіх лясоў

Беларуска-расійская пошукавая група мае намер знайсці пад Гродна пахаванне воінаў з часоў Першай сусветны вайны

Вядома, што ў лютым 1915 года 20-ы вайсковы корпус 10-й рускай арміі прарываўся з Аўгустоўскіх лясоў у бок Гродна. Вяліся жорсткія баі з кайзераўскімі войскамі. Па некаторых звестках, у Аўгустоўскіх лясах расійская армія страціла тады больш за тры тысячы салдатаў і афіцэраў. Як гаворыць камандзір першай спецыялізаванай роты 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна Міністэрства абароны Беларусі Іван Цётушкін, з розных крыніц патроху набіраюцца звесткі, каб весці пошукі пахаванняў.

Да беларускіх вайскоўцаў далучыліся і школьнікі з пошукавага клуба «Уралец» горада Азёрска Чэлябінскай вобласці Расіі. Пагартаўшы архіўныя дакументы, яны даведаліся: у Аўгустоўскіх лясах ёсць і магілы салдатаў — іх землякоў. Яшчэ ў красавіку каля вёскі Рацічы вайскоўцы пошукавага батальёна выявілі астанкі невядомага салдата 336-га Чэлябінскага пяхотнага палка, яны былі ўрачыста перазахаваны 2 ліпеня ў крыпце Храма Усіх Святых і бязвінна забітых у Айчыне нашай у Мінску.

Тыя, хто вядзе пошукі, ужо знайшлі астанкі яшчэ 20 чалавек. Па ўсёй верагоднасці ўсе яны — салдаты Першай сусветнай вайны.

Як паведамілі ў абласным ваенкамаце, знойдзеныя ў выніку раскопак астанкі воінаў будуць перазахаваны ў брацкай магіле, на ёй паставяць помнік.

СУСТРЭЧЫ

Госця з Марый-Эл

Вера Новік піша гісторыю роднай вёскі, што на Дзятлаўшчыне

Адам Мальдзіс

Калі ў рэдакцыю "Голаса Радзімы" завітала намесніца дырэктара Цэнтра нацыянальных культур Міністэрства культуры Валянціна Грыцкевіч, у пакоі была яшчэ адна наведвальніца.

— А я пазнала вас, — сказала Валянціна Грыцкевіч госці, — вы прыязджалі ў Мінск на кангрэс Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, выступалі на ім з дакладам пра сваю родную вёску, а імя і прозвішча ваша, калі мне памяць не здраджвае, Вера Новік.

— Так, — узрадавалася госця. — Глядзіце, не забыліся! Столькі ж часу прайшло...

— А вы, па-ранейшаму выкладаеце гісторыю ў Марыйскім універсітэце? — уключыўся ў гаворку я.

— І яшчэ падзарабляю ў трох месцах, - усміхнулася Вера Новік. — А што зробіш… Жыццё ў нас, у Расійскай Федэрацыі, цяпер цяжкаватае, асабліва на перыферыі. Крызіс даў пра сябе ведаць.

— У нас ёсць магчымасць завяршыць падрыхтоўку да друку другога, значна пашыранага выдання энцыклапедычнага даведніка "Беларусы і ўраджэнцы Беларусі ў памежных краінах". Артыкул пра вас для гэтага выдання ёсць, але напісаны ён, так сказаць, завочна. Таму, на ўсякі выпадак, раскажыце пра сябе яшчэ і самі. Наколькі я памятаю, вы родам з Дзятлаўскага раёна?

— З вёскі Малая Воля — прыгожая такая назва, як і сядзібы паабапал вуліцы. Цяпер заканчваю пісаць пра сваю "малую радзіму" кніжку. Хачу паказаць паўсядзённы побыт — ранейшы і цяперашні, самабытны фальклор. Ну, і асабістымі ўспамінамі падзялюся.

— Бацькі вашы, відаць, настаўнікамі былі?

— Не, звычайныя сяляне. Вучыць мяне паслалі ў Казлоўшчынскую дзесяцігодку. Пасля выкладала гісторыю ў сваёй роднай вёсцы, адначасова завочна вучылася на гістфаку БДУ. І тут нечакана, як кажуць, па сямейных абставінах пераехала ў Йашкар-Алу, сталіцу тагачаснай Марыйскай аўтаномнай рэспублікі. Спачатку займалася краязнаўствам, а з 1973 года і да сённяшняга дня выкладаю гісторыю ва універсітэце. Вучылася ў аспірантуры Ленінградскага дзяржуніверсітэта: вывучала там праблемы польскай грамадскай думкі эпохі Адраджэння. А кандыдацкую дысертацыю прысвяціла філасофскай спадчыне Анджэя Фрыча Маджэўскага, папулярнага і на беларускіх землях. Яго поглядам прысвечана большасць маіх навуковых прац.

— А суайчыннікаў ці спрабавалі шукаць?

— Чаму ж, сустрэлася з паэтэсай і народнай мастачкай Нінай Жыбрык. Яна родам з Дзяржынскага раёна, аўтар некалькіх паэтычных зборнікаў на рускай мове. У сваім доме ў пасёлку Мачалішчы стварыла сапраўдны музей. Пра яе, дарэчы, я напісала артыкул для "Голасу Радзімы". Такіх знаёмстваў станавілася ўсё больш. Па святах мы пачалі ліставацца, з зайздрасцю глядзелі, як дружна гуртуюцца іншыя нацыянальнасці. І сёлета вырашылі стварыць сваю аўтаномію.

Вера Новік (чацвертая злева) сярод паплечнікаў

— То добра, што мы сустрэліся, — падсумавала Валянціна Грышкевіч. — Сёлета пры Міністэрстве культуры створаны Кансультатыўны савет па справах беларусаў замежжа… Запісвайце мой тэлефон, звяртайцеся. Паспрабуем дапамагчы з касцюмамі для мастацкай самадзейнасці, літаратурай, парадамі, У наступным годзе мяркуем правесці фэст калектываў нашай дыяспары. Спадзяюся, сустрэнемся на ім у Мінску.

Падарожжа па Вілейцы заўсёды нязменна пачынаю з Вілейскага раённага краязнаўчага музея. Тым болей, што кожная новая сустрэча з гэтай скарбніцай памяці дорыць і дорыць новыя адкрыцці. Такія ўжо тут людзі працуюць – энергічныя шукальнікі звестак пра свой край і яго слаўных ураджэнцаў.

Знічкі Айчыны

Вілейка. 1916 г.

Вілейка. Георгіеўская плошча. Пачатак XX ст.

Вілейка. Павятовы з'езд. Пачатак XX ст.

Вілейка. Жаночая гімназія. Пачатак XX ст.

Алесь Карлюкевіч

І сёлетнім ліпенем, калі мы з Уладзімірам Аляксеевічам Ліхадзедавым завіталі ў Вілейку, то навуковы супрацоўнік музея і ўкладальнік гісторыка-дакументальнай хронікі Вілейскага раёна "Памяць" Вольга Аляксандраўна Коласава прапанавала паказаць "нешта цікавае". Адразу павезла нас да сядзібы мясцовага прадпрыемства раённых энергетычных сетак, якое раней узначальваў вядомы на Міншчыне краязнаўца Анатоль Рогач. Аўтар многіх гістарычных адкрыццяў і сур'ёзных навуковых даследванняў, пастаянны выступоўца з грунтоўнымі дакладамі на рэгіянальных краязнаўчых канферэнцыях, на вялікі жаль, ён нядаўна пайшоў з жыцця. Апантаны збіральнік гістарычных памятак пра Вілейшчыну розных часін, Анатоль Рогач звозіў у горад знойдзеныя ў вёсках раёна жорны, дзіўныя камяні. Так спакваля і быў створаны сапраўдны міні-музей гэтых маўклівых сведкаў мінуўшчыны. Па сваёй энергетыцы, мушу зазначыць, не горшы, чым вядомы Музей валуноў, што месціцца ў мінскім мікрараёне Уручча. Аднаму з вілейскіх валуноў, на якім засведчаны сляды апрацоўкі каменя старажытным чалавекам, нават нададзены статус помніка. Разглядаючы гэтыя валуны, мы гаворым з Вольгай Аляксандраўнай: пара ўжо і філіял раённага музея тут адкрыць. А ў самім двары прадпрыемства (астатнія камяні выстаўлены перад арганізацыяй, на гарадской вуліцы) — камень-помнік Юзафу Пілсудскаму. Выцягнуты аднекуль з занядбанай лясной мясціны, ён выклікаў нямала спрэчак. Была ініцыятыва з боку польскіх дыпламатаў устанавіць яго на тэрыторыі польскай амбасады ў Мінску. Вілейскі краязнаўца і мясцовыя музейшчыкі выступілі супраць. Відаць, спрэчку ўсё ж трэба неяк вырашыць. І, відавочна, тэрыторыя дзеючага прапрыемства — таксама не зусім прыгоднае месца для ўзнаўлення памяці пра колішняга прэзідэнта Польшчы. Тым болей, што першапачаткова помнік знаходзіўся ў іншым месцы.

Калі згадваю гэты прыклад краязнаўчай руплівасці, на памяць прыходзіць і легендарны вілейскі фатограф Берка Берман (нарадзіўся ў 1881 годзе ў Іўі). Ён у свой час стаў ахвярай бальшавіцкай улады па прычыне сваёй цікаўнасці да польскага прэзідэнта. Праўда, яшчэ да Масціцкага, а не Пілсудскага. Сфатаграфаўшы кіраўніка тагачаснай Польшчы ў час яго прыезду ў Вілейку ў 1930 годзе, мясцовы фотамайстар адправіў партрэт свайму герою. Факт гэты, як і тое, што яшчэ ў сярэдзіне 20-х Бермана ўзнагародзілі медалём "3 мая", успомнілі ў 1939-м, калі была змена ўлады. Сляды фатографа згубіліся недзе ў сталінскіх астрогах. У мясцовым музеі захоўваецца каля дваццаці фотаздымкаў Вілейкі, зробленых Берманам. Захаваўся і дом, дзе была фотамайстэрня. Ёсць і ініцыятыва зрабіць у ім музей фатаграфіі.

Мяркую, што ў будучым музеі магла б размясціцца калекцыя фотаздымкаў сямейнага характару ўраджэнцаў Вілейкі і Вілейскага раёна. А людзі адсюль выправіліся ў вялікі свет і сапраўды цікавыя, адметныя сваімі лёсамі і справамі. У Вілейцы ў 1945 годзе нарадзілася Наталля Пятроўна Машэрава, доктар філасофскіх навук. Вёска Жаўткі — радзіма партызанскага камандзіра, Героя Савецкага Саюза Андрэя Іванавіча Валынца (яго імя носіць адна з гарадскіх вуліц). У Касуце ў 1954 годзе нарадзіўся Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, заслужаны юрыст нашай краіны Пётр Пятровіч Міклашэвіч. Апошні міністр гандлю Савецкага Саюза Кандрат Зігмундавіч Церах (нарадзіўся ў 1935 годзе) — таксама з Вілейшчыны, з вёскі Альковічы. У 1977—84 гадах займаў пасаду старшыні Белкаапсаюза. У 1984 годзе ўраджэнца Вілейскага раёна прызначылі намеснікам старшыні Савета міністраў БССР. На пасаду саюзнага міністра Кандрата Зігмундавіча вылучыў тагачасны старшыня Саўміна СССР Мікалай Рыжкоў. Наш зямляк адзначаны за сумленную працу ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў, "Знак Пашаны".

З 1948 па 1951 год у Вілейскай бальніцы працаваў ураджэнец вёскі Жаўткі Мікалай Нікадзімавіч Маліноўскі. Яго навуковыя заслугі, багаты практычны досвед у медыцыне двойчы адзначаны Дзяржаўнай прэміяй СССР (1974 і 1984 гады). Такія прыклады досыць рэдкія, калі гаварыць пра 70-80-я гады. Гэта ў 1940-1950-я Сталінская прэмія прысуджалася вучоным і дзеячам мастацтва па тры-чатыры разы, а часам і болей. Мікалаю Нікадзімавічу Маліноўскаму прысвоена і званне Героя Сацыялістычнай Працы. Доўгі час віляйчанін працаваў галоўным хірургам чацвёртага галоўнага упраўлення Міністэрства аховы здароўя СССР. Установа дастаткова вядомая ў звязку з тым, што менавіта яна апекавалася здароўем кіраўнікоў дзяржавы, дзеячаў культуры і мастацтва. Сярод пацыентаў нашага земляка былі Любоў Арлова, Сяргей Лемешаў, Георгій Жукаў, Юрый Андропаў, Міхаіл Гарбачоў, іншыя маскоўскія знакамітасці.

Калі ўжо размова зайшла пра медыкаў, то варта згадаць і Антона Шчэрбу, загадчыка хірургічнай клінікі Люблінскай медыцынскай Акадэміі. Ён таксама нарадзіўся на вілейскай зямлі. Доўгі час прафесарам Акцюбінскага медыцынскага інстытута працаваў віляйчанін В. Савіцкі. З медыкаў — ураджэнцаў Вілейскага краю — і заслужаны ўрач Расійскай Федэрацыі Міхаіл Наркевіч.

Сёе-тое з гэтых фактаў і мы з Уладзімірам Ліхадзедавым расказваем Вользе Аляксандраўне Коласавай. А яна ў сваю чаргу дзякуе за падказку і выказвае спадзяванне, што і экспазіцыя, і музейныя фонды папоўняцца новымі звесткамі пра Вілейку, Вілейскі край і іх слаўных сыноў і дачок.

© В поисках утраченного

Паштоўкі з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава

МАЙСТРЫ

Кветка для дваіх

Прадзядуля Уладзіслава Ярашэвіча, якога, праўда, ён ні разу не бачыў, быў кавалём. Мой жа суразмоўца пасля школы пайшоў у ювеліры. У новым асяроддзі яму пашчасціла вучыцца ў выдатнага майстра Аляксандра Міхалевіча. Менавіта той падзяліўся з юнаком сакрэтамі мастацкага карыстання малатком і накавальняй. Уладзіслава зацікавіла, што з астаткаў метала можна рабіць арыгінальныя артрэчы. Так ён, акрамя ювеліркі, пачаў займацца і мастацкім каваннем.

Людміла Мінкевіч

— Вырабы Ярашэвіча здзіўляюць. Камарык з гэткімі ж, як у жывога, доўгімі нагамі і носам, толькі вагой... сто кілаграм. Ці цвік, даўжынёй са шпагу. А як вам мініяцюрны залаты падсвечнік ці металічныя бакалы для шампанскага?

Хоць займаецца каваннем трэці год, ды, здаецца, усё яму пад сілу — як чараўнік, ажыццяўляе любое жаданне кліента. Аднойчы да майстра звярнулася група ўрачоў, якія праводзілі на пенсію калегу, вядомага хірурга. У падарунак вырашылі паднесці залаты скальпель, ды каб яшчэ і рэзаў. І зрабіў! А год таму — званок з Масквы. Рэдактар вядомага расійскага выдання папрасіла яго зрабіць сямісвечнік. “Прыехала, растлумачыла, які падсвечнік хоча, — успамінае майстар. — Я ж прапанаваў зрабіць штосьці больш арыгінальнае, магчыма, падгледжанае ў прыроды. Паказаў эскізы. Толькі паглядзела — вочы загарэліся: “Хачу гэты!” Дастала з кішэні жменьку камянёў і працягнула: “А гэтым дапоўніце!”

Уладзіслаў Ярашэвіч і яго твор

Нельга адмаўляць чалавеку: мары павінны збывацца.. Так нарадзілася “Кветка жыцця”, упрыгожаная матылямі і стракозамі з крыламі з сапфіраў і ізумрудаў.

Уладзіславу падабаецца ўладарыць над агнём, рабіць метал падатлівым, як пластылін, і “ляпіць” з яго неверагодныя рэчы. Не рукамі, канешне, а кавальскімі інструментамі: працаваць жа прыходзіцца з тысячамі градусаў! Да агню майстар ставіцца больш як да сябра. “Я кармлю яго, паю, даглядаю, — усміхаецца. — Ён як жывая істота, якая патрабуе ўвагі і клопату. З ім сябраваць трэба, а то раззлуецца — і ўкусіць можа”.

Якім будзе яго чарговы выраб — тое ў многім залежыць ад настрою. Майстар прызнаўся: калі сумна, хочацца зрабіць нешта простае, накшталт невялікага падсвечніка ці нескладанай лодкі. Калі ж душа разварочваецца ад шчасця, рукі імкнуцца майстраваць вытанчаную рэч.

— Калі я толькі пазнаёміўся з Вольгай, будучай жонкай, то зрабіў ружу, якая не паўторыцца ніколі і будзе цвісці ўсё жыццё толькі для нас, — згадвае каваль-ювелір. — Як яна стваралася, як у яе ўкладвалася душа, Вользе я расказаў толькі праз нейкі час, калі адносіны сапраўды завязаліся. Мы назвалі кветку “Пачатак быцця”.

— Яго падарункі заўсёды нечаканыя і вельмі прыемныя! — з пяшчотай і захапленнем расказвае пра занятак любімага чалавека Вольга Круцік. — Гэта не жывыя кветкі, якія могуць звянуць на наступны дзень, не банальныя сувеніры, якія можна купіць у любой краме. Я ведаю: гэту рэч, заўсёды незвычайную, арыгінальную і адзіную ў прыродзе, ён стварыў дзеля мяне.

Уладыслава Ярашэвіча добра ведаюць і ён удзельнічае ў металічных вернісажах, разнастайных конкурсах і выставах. Цяпер у майстра з’явілася ўласная кузня, а значыць з’явіліся яшчэ большыя магчымасці для здзяйснення неардынарных і, як ён сам гаворыць, “бязвежавых” металічных ідэй.

Толькі вучыся!

Наталля Сцепановіч

Сёлета пад час уступнай кампаніі прэтэндэнтамі на месцы ў беларускіх вышэйшых навучальных установах было больш за сотню замежных грамадзян

Статыстыкадаедакладныязвескі: з усіх абітурыентаў-замежнікаў, якія маюць права паступлення ў тым ліку і на бюджэтныя месцы, 1 тысяча 41 чалавек прыбыў у Беларусь з Расіі. Астатнія, а гэта яшчэ больш за сто чалавек, – грамадзяне Казахстана, Кыргызстана, Таджыкістана, а таксама беларусы па нацыянальнасці, якія з’яўляюцца грамадзянамі замежных дзяржаў. Як адзначыў дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мінадукацыі Мікалай Фяськоў, «грамадзяне гэтых чатырох краін, а таксама беларусы па нацыянальнасці, якія з’яўляюцца грамадзянамі замежных дзяржаў, могуць прымаць удзел ва ўступнай кампаніі ў Беларусі з правам паступлення на бюджэтныя месцы». Гэтыя абітурыенты паступаюць у вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы ўсіх пяці краін па выніках уступных выпрабаванняў. У Беларусі, напрыклад, залічэнне правадзіцца па выніках цэнтралізаванага тэставання, у Расіі – паводле адзінага дзяржаўнага экзамена.

Мікалай Фяськоў падкрэсліў: «Статус асобы беларускай нацыянальнасці павінен быць абавязкова пацверджаны пасведчаннем аб нараджэнні». Калі адзін з бацькоў абітурыента з’яўляецца беларусам, то ён мае такія ж правы пры паступленні, як і грамадзянін Беларусі.

КРЫЖАВАНКА

Ганчарны круг

Па гарызанталі: 1. ... і рукі — моцныя зарукі (прык.). 4. ..., альбо шыналь. Драўляны нож для абточкі і аздаблення паверхні глінянага посуду. 11. Гарадскі пасёлак на Міншчыне, буйнейшы ў мінулым на Беларусі цэнтр ганчарнай вытворчасці. 12. Гарадскі пасёлак на Брэстчыне, былы буйны цэнтр па вырабе чорнаглянцаванай керамікі. 13. У гліне ... не гіне (прык.). 16. Тое, што і шуфляда. 17. ..., альбо пэндзлік. Прыстасаванне з каровінага рога, якое служыла ганчарам для размалёўкі вырабаў. 18. Лакальная назва бабачніка, глінянай пасудзіны для выпякання велікоднага пірага. 21. Керамічны выраб для абліцоўкі печаў, камінаў і інш. 22. Якая ..., такое і палатно ляжа (прык.). 23. Аздабленне керамічных вырабаў растворам гліны іншага колеру. 24. Старажытная вёска на Смаргоншчыне, дзе колісь выраблялі прыгожыя дэкаратыўныя талеркі. 25. ... з гаршка не насмяецца, бо абодва чорныя (прык.). 26. Аднадумнасць. 29. Разное ўпрыгожанне вяршынь закрылін; вільчык. 34. ... за ... і то цярпецца (прык.). 36. ..., альбо баўтуха. Раствор для загартоўвання глінянага вырабу. 37. Мірнае шчаслівае існаванне (перан.). 38. Гарадскі пасёлак на Міншчыне, дзе выраблялісяфігурныя пасудзіны ў выглядзе мядзведзяў, ільвоў і інш. 39. ..., альбо латушка. Глыбокая гліняная пасудзіна для смажання і тушэння мяса, бульбы.

Па вертыкалі: 2. Вельмі ранні час. 3. ...-свістулька. Гліняны выраб, які некалі ляпілі ва ўсіх ганчарных цэнтрах Беларусі. 5. ... — не гаршчок, не пераставіш (прык.). 6. Каралева кветак. 7. ..., альбо пытлік. Спецыяльная прылада з сетачкай, праз якую абсыпалі керамічныя вырабы парашком палівы. 8. Ручная .... Адзін з спосабаў вытворчасці ганчарных вырабаў. 9. Гарняцкая кірка. 10. Гліняная, на трох ножках пасудзіна для смажання страў. 14. Жанчына, надзеленая звышнатуральнымі здольнасцямі; ёю некалі лічылася і жанчына-ганчар. 15. Назва восі, на якой вярцеўся ганчарны круг. 19. Дзе вада, там і ... (прык.). 20. Народная гульня. Іншыя назвы: “Перагон”, “Салавей”, “Лавец”. 25. Назва аднаго з самых ранніх ганчарных вырабаў. 27. Спецыяльная печ для абпальвання ганчарных вырабаў. Ад гэтай назвы паходзіць слова “ганчарства”. 28. Адтуліна ў печы для абпальвання для праходу гарачых газаў. 30. Назва кавалка падрыхтаванай глінянай масы, дастатковай для вырабу адной пасудзіны. 31. Прысвятак беларускага народнага календара. “... — каровіна свята”. 32. У каго чорна глыба, у таго і хлеба ... (прык.). 33. Упрыгожаная арнаментам гліняная пасудзіна з вушкамі на баках. 35. Дэталь ганчарнага круга.

Лявон Целеш



Адказы на крыжаванку

Па гарызанталі: 1. Праца. 4. Шнара. 11. Ланцы. 12. Ружаны. 13. Канцыка. 16. Асада. 17. Ражок. 18. Форма. 21. Кафля. 22. Праага. 23. Анрое. 24. Кфава. 25. Кацёл. 26. Зроца. 29. Канёк. 34. Гаршок. 36. Абвара. 37. Лынія. 38. Рака. 39. Латка.

Па вертыкалі: 2. Ранк. 3. Цаука. 5. Нораў. 6. Ружа. 7. Сітца. 8. Лемка. 9. Кайло. 10. Рынка. 14. Чарадніца. 15. Кпжазіна. 19. Вяр-ба. 20. Анука. 25. Кубак. 27. Горан. 28. Дуча. 30. Камак. 31. Ната. 32. Сніба. 33. Ваза. 35. Дыск.

Заснавальнік: Рэдакцыя газеты «СБ»
Рэдактар Віктар Харкоў
Адрас: пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61
Тэлефон рэдакцыі: +375 17 288—12—80; факс: +375 17 288—12—80
Бюро па рэкламе: Тэл. +375 17 290—60—11
E—mail: golas_radzimy@tut.by
Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
Аб’ём выдання: 1 друк. арк.
Тыраж: 1950
Заказ: 760

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках “Голасу Радзімы”, могуць не супадаць.
© “Голас Радзімы”, 2010